## Урок 52. Тэма дружбы ў апавяданні Генрыха Далідовіча “Страта”

**Мэты і задачы ўрока:** засяродзіць увагу вучняў на змесце 3 і 4 частак твора, звярнуць увагу на майстэрскае апісанне душэўнага стану Стася, яго хваляванняў, перажыванняў, пакут (рэўнасці, зайздрасці, першаснай непрыязнасці да Міці, усведамленне сваёй «мізэрнасці» ў параўнанні з навічком-аднакласнікам), сачыць за паступовай эвалюцыяй узаемаадносін хлопчыкаў дапамагчы зразумець пазіцыю аўтара-апавядальніка; спрыяць развіццю ўмення аналізаваць учынкі герояў літаратурнага твора, удасканальваць уменне вызначаць эпізоды важныя для характарыстыкі герояў; садзейнічаць выхаванню умення сябраваць, шанаваць сапраўдную дружбу.

**Тып урока** — урок камбінаванай будовы.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік «Беларуская літаратура. 5 клас»; прыказкі і выказванні пра сяброўства, выстава малюнкаў вучняў.

**Эпіграф да ўрока**

*Два чалавекі могуць выратаваць адзін аднаго там, дзе адзін загіне.*

*Анарэ дэ Бальзак*

Ход урока

**1. Арганізацыйны момант**

**2. Праверка дамашняга задання**

– Сціслы пераказ 1 і 2 частак апавядання на аснове цытатных характарыстык Міці Бокуця (2 вучні).
– Гутарка па пытаннях вучэбнага дапаможніка.
– Чытанне выказванняў і прыказак пра сяброўства.
*Не той сябра, хто вусны мёдам мажа, а той, хто ў вочы праўду кажа.*
*З кім пазнаешся, такім і сам станешся.*
*З кім павядзешся, ад таго і набярэшся.*
*Той не можа быць другам, хто абыдзе ў бядзе кругам.*
*Не карай, Божа, нічым, як сябрам ліхім.*
*Лепш сто сяброў, як сто рублёў.*
*Новых сяброў нажывай, але старых не забывай.*
*Гара з гарою не сходзяцца, а чалавек з чалавекам заўсёды.*
*Птушка моцная крыламі, а чалавек дружбай.*

*З разумным павядзешся – розуму набярэшся, а з дурнем і свой страціш.*

– Прагляд партрэтаў галоўных герояў апавядання (па жаданні).

**3. Паведамленне тэмы, вызначэнне мэт і задач урока**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Слова настаўніка**

На ўроку мы працягнем знаёмства з апавяданнем Генрыха Далідовіча “Страта”, уважліва паслухайце эпіграф да ўрока, як вы думаеце, якой тэме ён прысвечаны? Тэма нашага сённяшняга ўрока таксама будзе прысвечана дружбе.

**4. Вывучэнне новага матэрыялу**

Давайце паспрабуем да чытання 2 і 3 частак твора адказаць на пытанне: “Ці могуць Стась і Міця стаць сябрамі?” і паставіць адпаведную колькасць знакаў у тым ці іншым слупку табліцы, а ў канцы ўрока мы зноў звернемся да табліцы.

| **Ці могуць Стась і Міця стаць сябрамі** | **Згодны** | **Незгодны** | **Не ведаю** |
|---|---|---|---|
| Пачатак заняткаў | + 7 | – 6 | ? 4 |
| Канец заняткаў | | | |

**Чытанне 3 і 4 частак апавядання настаўнікам**, *падчас якога вучні адзначаюць незразумелыя словы (с. 78 – 82, таксама падаюцца словы, што сустрэнуцца ў 5 і 6 частках, якія вучні будуць дачытваць дома)*

**Слоўнікава-лексічная работа**

*Слоўнічак*

*Блажыць* – нездаровіцца, дрэнна.
*Трымцець* – дрыжаць.
*Падаклярavaць* – наабяцаць.
*Сіберны* – тут: вельмі моцны, рэзкі, люты.

*Стаяк* – тут: цагляная печка.
*Пасмяглы* – засохшы.
*Кемны* – разумны.

*Спажыўны* – тут: якасны, карысны, смачны.

**Вывучэнне чытацкага ўспрымання**

**Гутарка па пытаннях**

1. Якімі пачуццямі прасякнуты 3 і 4 часткі апавядання?

2. Што вы новага даведаліся пра герояў.
3. Хто з герояў вам больш запоўніўся і чаму?

4. Якія эпізоды твора вы слухалі з найбольшым хваляваннем? Перакажыце або зачытайце іх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Аналітычная гутарка, выкананне заданняў**

1. З чаго пачынаецца дружба Міці і Стася?

2. З якім пачуццем пачаў ставіцца Стась да сябра, калі даведаўся, што ён хворы?

3. Каму Міця даверыў свой сакрэт? Чаму ён прасіў нікому не гаварыць пра хваробу? Зачытайце радкі з твора (с. 79–80).

4. Чаму Стась вырашыў быць ля хворага хлопчыка кожны дзень?

5. Чым займаліся хлопчыкі? Як Стась дапамагаў Міцю?

6. Ці можна Стася і Міцю лічыць сябрамі? Абгрунтуйце свой адказ.

7. Ці хацелі б вы мець такога сябра, як Стась?

8. Паразважайце над народным выслоўем "Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе кругам". Як стасуецца яно да тэксту апавядання.

**Складанне табліцы "Вызначэнне асноўных рыс характару Міці і Стася"**

| Міця | Стась |
|---|---|
| Душэўна прыгожы, далікатны, высакароднасць і сціпласць. Сур'ёзны, сталы, глыбакадумны, спакойны, не ганарлівец, праўдзівы, клапатлівы, далікатны, добры, настойлівы, шчыры, стрыманы, мужны | Задуменны, летуценнік, ветлівы, чулы, спагадлівы, міласэрны, добры, верны, адказны ў адносінах да сяброўств |

**5. Замацаванне вывучанага**

**Віктарына "Пазнай героя"**

1. "У кепачцы, у плашчыку, ён сядзеў на нейкім дзіўным, здаецца, сплеценым ці то з карэнняў, ці то з дубцоў крэсле..."

2. "За восень я прывык да стрыманага, крыху дзікаватага, але шчырага суседа па парце..."

3. "Я не умею гуляць у футбол... а па-другое, мне няможна бегаць..."

4. "Я з той часіны глыбока ў душы пачаў насіць Міцеў цяжкі сакрэт..."

5. "Ногі і рукі яго трымцелі…"

6. "Не буду злы, няшчыры ці помстлівы…"

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Падрыхтоўка параўнальнай характарыстыкі герояў твора Генрыха Далідовіча «Страта» Міці і Стася. Работа з табліцай**

| Міця | Пытанне | Стась |
|---|---|---|
| | Паходжанне | |
| | Знешні выгляд | |
| | Захапленні | |
| | Рысы характару | |
| | Адносіны да вучобы | |
| | Погляды на жыццё | |
| | Стасункі з равеснікамі | |
| | Стасункі з бацькамі | |
| | Стасункі з настаўнікамі | |
| | Жыццёвыя мэты | |

**Складанне сінквейнаў "Міця" і "Стась"**







РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**6. Падагульненне**

Што ж дало Міцю сяброўства са Стасем? А Стасю з Міцем?

Такім чынам, дружба дапамагла абодвум хлопцам: Міцю вызваліла з адзіноты, дапамагла жыць, дала веру ў дабро, сілы, не зрабіла злым і сумным, а Стася навучыла шчырасці, міласэрнасці і спачуванню, дапамагло разумець чужое гора і напоўніла душу пяшчотай.

**7. Падвядзенне вынікаў, выстаўленне адзнак**

Давайце звернемся да нашай табліцы “**Ці могуць Стась і Міця стаць сябрамі**”, ці змяніліся вашы адказы на яго пасля чытання і аналізу 3 і 4 частак, запоўніце яе адпаведнымі знакамі.

**8. Рэфлексія**

Перадайце свае пачуцці, настрой, навеяныя творам. У якіх фарбах можна перадаць ваш душэўны стан? Стварыце пры дапамозе каляровых алоўкаў, фламастараў сваё *«Воблака настрою»*.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**9. Інфармацыя пра дамашняе заданне і інструктаж па яго выкананні**

1. Прачытаць апавяданне да канца.

2. Падабраць назвы да частак твора.

3. Падрыхтаваць вуснае паведамленне пра ўзаемаадносіны Стася і Міці Бокуця.

4. Падрыхтаваць вуснае сачыненне-мініяцюру па народным выслоўем «Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе кругам» (па жаданні).

5. Выпісаць у сшытак па літаратуры словы-асацыяцыі да паняцця «сапраўдны сябар».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ